*С. В. Матвейчык*

# АКТУАЛЬНАСЦЬ ЗАХАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ТКАЦТВА Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Сёння ўсё часцей паўстае пытанне пра месца народнай культуры, і ткацтва ў прыватнасці, у сучасным жыцці. Ці патрэбна яно і па якіх шляхах павінна развівацца?

Натуральна, што адкруціць кола часу немагчыма, немагчыма і непатрэбна вяртанне да рамеснага спосабу вытворчасці тканін. Прадмет успрымаўся як частка навакольнага асяроддзя чалавека, як духоўна-змястоўны элемент. З рэччу чалавек жыў у адзінстве і ўспрымаў рэч як свайго памочніка. Ужо гэта значна адрознівае прадметны свет народнай творчасці ад прадметнага свету тэхнізаванага веку [2, с.122].

У гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва напачатку зараджэння прамысловасці ўзнік рух за адраджэнне рамёстваў. Англійскі мастак, пісьменнік, грамадскі дзеяч, які адыграў значную ролю ў развіцці культуры сваёй эпохі, Уільям Морыс (1834–1896) крытыкаваў увядзенне машыннай вытворчасці ў галіну вырабу мастацкіх рэчаў і мэблі, быў за ручную працу рамеснікаў. Як чалавек паслядоўны, ён пабудаваў сабе па ўласным архітэктурным праекце «Red House» з чырвонай цэглы, прытрымліваючыся добротнага сярэднявечнага будаўніцтва. Унутранае ўбранства таксама было створана рамеснікамі па эскізах мастакоў і архітэктараў: мэбля, дэкаратыўныя тканіны і інш. [1]. У далейшым ён заснаваў фірму «Морыс, Маршал і Фолкнер», пазней – «Морыс і К$^{o}$», якая прымала заказы на выраб рэчаў рамесніцкай вытворчасці. Менавіта тут былі закладзены рысы стылю мадэрн і асновы мастацкага канструявання. Прастата, непасрэднасць і логіка творчасці былі характэрнымі рысамі іх мастацкай дзейнасці. У працэсе канструявання мэблі Морыс арыентаваўся на простыя формы з дакладным падзелам на гарызанталь і вертыкаль. Менавіта ў сялянскім інтэр’еры, у жыллі рабочых і рамеснікаў шукаў Морыс матывы дызайну, якія яго натхнялі выразнасцю канструктыўных формаў і пазбаўленасцю дэкаратывізму. Гэта адзін са шматлікіх прыкладаў звяртання прафесійнага мастака да народнага побыту ў пошуках прадметаў, дызайн якіх адточваўся стагоддзямі. На сваёй фабрыцы Морыс адрадзіў старажытны ткацкі станок і афарбоўку тканін натуральнымі фарбамі. (У наш час з перанасычанасцю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разнастайнымі хімічнымі рэчывамі нядрэнна таксама было б звярнуцца да праверaных раслінных фарбавальнікаў, хаця б у якасці альтэрнатывы.)

Вырабы кампаніі аказаліся надзвычай дарагімі, гэта былі прадметы раскошы, простыя людзі не маглі дазволіць набываць іх. Яго ідэі вяртання да рамеснага спосабу вытворчасці былі першапачаткова ўтопіяй, але далі значны штуршок далейшаму развіццю рамёстваў.

Нягледзячы на тое, што Морыс адмоўна адносіўся да тэхнічнай цывілізацыі, распрацаваныя ім для кустарных вырабаў прынцыпы формаўтварэння прадметаў аказаліся значнымі для сферы машыннай вытворчасці.

Менавіта эпоха прамысловасці прымусіла паглядзець на развіццё народнага ткацтва нанова і ставіць пытанне пра духоўную каштоўнасць апошняга. Немэтазгодна супрацьпастаўляць прамысловасць і рамесніцкі спосаб вытворчасці: «Наўрад ці цяпер хто возьмецца сцвярджаць, што прамысловая ўніфікацыя з яе прынцыпам стандартызацыі не чужая прыродзе народнага мастацтва. З канца 1960-х гг. стала нарэшце для ўсіх відавочным фактам гібель народнага мастацтва ў прамысловай сістэме» [2, с.113]. Сёння можна казаць пра паралельнае існаванне і ўзаемаўзбагачэнне рамяства і прамысловасці.

Сапраўды, народнае ткацтва практычна знікае, рэдка дзе ў хаце стаяць кросны. Але яго развіццё і вывучэнне працягваюцца ў дзіцячых студыях і гуртках, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, аматарскіх аб'яднаннях. Трэба прызнаць, што рэчы, зробленыя ўручную, нятанныя і могуць заставацца ў асноўным прадметамі мастацтва. Для паўсядзённага карыстання выдатна падыходзяць рэчы фабрычнай вытворчасці. Мастацтва народнага ткацтва як этнічная памяць павінна развівацца сваім шляхам, каб потым узбагаціць сваімі знаходкамі прамысловасць.

Ручное ткацтва нязменна застаецца невычэрпнай крыніцай вобразаў і тэхналогій для прамысловай вытворчасці. Да народнага ткацтва звяртаюцца прафесійныя мастакі.

Сутнасць народнага ткацтва ў непарыўнасці традыцыі, каштоўнай эстэтыцы калектыўнага, звязанай з народнай мастацкай свядомасцю. Вызначаемае светаразуменнем народа, якое склалася гістарычна, ткацтва ўяўляе сабой выразную сістэму поглядаў. Вобраз у народным ткацтве заўсёды шырэй па сваім значэнні, чым змест, які звязвае яго з тым ці іншым часам. Дзякуючы гэтаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнае ткацтва атрымлівае пэўную самастойнасць, пазачасавую актуальнасць.

---

*1. Гольдзамт, Э. А.* Уильям Моррис и социальные истоки современной архитектуры / Э. А. Гольдзамт. – М.: Стройиздат, 1973. – 174 с.

*2. Некрасова, М. А.* Методические проблемы народного искусства / М. А. Некрасова // Проблемы народного искусства / НИИ теории и истории изобразит. искусств Акад. художеств СССР; под ред. М. А. Некрасовой, К. А. Макарова. – М.: Изобр. искусство, 1982. – С. 108–127.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ